Минская духовная академия

16.10.2018

# Студенты во главе с Ректором Академии приняли участие в Международном научном круглом столе «Современные библейские исследования»



**16 кастрычніка ў межах выставачнага праекта “Беларусь і Біблія” ў бібліятэцы прайшоў міжнародны навуковы круглы стол “Сучасныя біблейскія даследаванні”.**

Арганізатарамі выступілі Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Група даследавання рукапісаў (ЗША), міжнароднае грамадскае аб’яднанне “Хрысціянскі адукацыйны цэнтр імя святых Мяфодзія і Кірыла”, кафедра біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння Інстытута тэалогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кафедра біблеістыкі Мінскай духоўнай акадэміі імя свяціцеля Кірылы Тураўскага.

У ходзе работы круглага стала адбылася прэзентацыя зборніка дакладаў V Міжнароднага ўсходнееўрапейскага сімпозіума даследчыкаў Новага Запавету (SNTS) «Евангельский образ Господа Иисуса Христа в церковной традиции и библейской науке», які выйшаў у

жніўні 2018 года ў выдавецтве Белдзяржуніверсітэта ў рамках сумеснай праграмы “Тэалогія ва ўніверсітэтах”.

**Мадэратарамі круглага стала з’яўляліся:**

**святар Святаслаў Рагальскі** – кандыдат багаслоўя, дацэнт кафедры біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння Інстытута тэалогіі БДУ, старшыня Хрысціянскага адукацыйнага цэнтра імя святых Мяфодзія і Кірыла,
**Аляксандр Суша** – кандыдат культуралогіі, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці.

**З паведамленнямі выступілі:**

**архімандрыт Сергій (Акімаў)** – доктар багаслоўя, прафесар, рэктар Мінскай духоўнай акадэміі, загадчык кафедры біблеістыкі Агульнацаркоўнай аспірантуры і дактарантуры,
**Скот Кэрал** – доктар (PhD), кіраўнік Групы даследавання рукапісаў (ЗША), даследчык старажытных манускрыптаў,
**ксёндз Ян Крэміс** – доктар тэалогіі, старшыня секцыі па перакладзе літургічных тэкстаў і афіцыйных дакументаў Касцёла пры Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў у Беларусі,
**Наталля Герасімовіч** – начальнік упраўлення рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ,
**святар Міхаіл Самкоў** – кандыдат багаслоўя, выкладчык Мінскай духоўнай акадэміі,
**Андрэй Паўлючык** – магістр тэалогіі, пастар Рэфармацкай прэсвітарыянскай царквы.

Удзельнікам круглага стала быў перададзены прывітальны зварот ад **Карла-Вільгельма Нібура** – прафесара Йенскага ўніверсітэта імя Фрыдрыха Шылера (Германія), прэзідэнта ўсходнееўрапейскай камісіі Таварыства даследчыкаў Новага Запавету.

**Марыя Малочка** і **Ганна Казека**, вучаніцы 11 “А” класа гімназіі № 11 г. Мінска, выступілі з паведамленнем-эсэ “Біблія ў маім жыцці”.